

МОЦ СЕЛЬСКАЙ ЖАНЧЫНЫ 13



ХАЛОДНЫ СЮРПРЫЗ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛІСТАПАДА 2022 г. ПЯТНІЦА № 227 (29849)


## КОРАТКА

• **Больш за 3,1 млн чалавек у Беларусі прышчэплены супраць грыпу.**

• «БЕЛДЖЫ» выйшаў у лідары продажаў у Беларусі ў сегменце новых легкавых аўто.

• **Новую лінію па выпуску пліткавага шакаладу запусцяць на «Спартаку» ў 2023 годзе.**



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Важна працягваць выхоўваць культуру выплаты падаткаў. Фактычна дзяржава заключае грамадскі дагавор з бізнесам: дае яму прастату і функцыянальнасць у выплаце падаткаў, са свайго боку, бізнес павінен добрасумленна дэклараваць выручку, якая з'яўляецца асновай для іх вылічэння. Варта таксама павышаць долю безнаяўных плацяжоў як элемента не толькі зручнасці, але і кантролю за даходамі. Як вядома, з 1 студзеня 2023 года для фізічных асоб уводзіцца дадатковы асаблівы рэжым падаткаабкладання — падатак на прафесійны даход. Пераход на такі рэжым падаткаабкладання ажыццяўляецца добраахвотна. Цяпер праект адпаведнай пастановы знаходзіцца на зацвярджэнні ў Савеце Міністраў».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы і далей будзем працаваць з ПВТ і выкарыстоўваць яго на карысць краіны»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам дырэктара Парка высокіх тэхналогій Усевалада Янчэўскага. У цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы — пытанне функцыянавання Парка высокіх тэхналогій, увогуле развіццё ІТ-сферы краіны.**



Фота БелТА.

Аднак перш чым абмеркаваць эканамічны блок пытанняў, Прэзідэнт звярнуўся да падзей 2020 года. На тым мяцяжы, які быў навязаны нашаму народу, супрацоўнікі Парка высокіх тэхналогій праявілі сябе, мякка кажучы, не з лепшага боку. Атрымліваючы прыстойны даход, калі параўноўваць з сярэднім заробкам у Беларусі, некаторыя з іх аддалі перавагу вялікім грашам і выконвалі каманды сваіх замежных гаспадароў, часцей за ўсё заакіянскіх.

Негатыўная тэндэнцыя — ужо ў мінулым. Парк высокіх тэхналогій, як ні хацелі б некаторыя заакіянскія гаспадары, працуе. Прычым даволі паспяхова і на карысць нашай краіны.

### Высокія тэхналогіі — у трэндзе

«На кожным прадпрыемстве — свой Парк высокіх тэхналогій: пачынаючы ад Акадэміі навук і заканчваючы МАЗам, БелАЗам і іншымі прадпрыемствамі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — На кожным прадпрыемстве ў нас ёсць вельмі моцныя айцішнікі, якія не проста на заакіянскага дзядзьку працуюць, а ствараюць канчатковы прадукт».

Па прыклад далёка хадзіць не трэба: яго прывёў сам кіраўнік дзяржавы. На адным з гігантаў айчыннай прамысловасці — БелАЗе — спецыялісты, якія ствараюць праграмнае забеспячэнне і ўжо гатовыя прадукты, займаюць цэлы шматпавярховы корпус. Па словах беларускага лідара, Парк высокіх тэхналогій адыграў у гэтым вельмі важную ролю.

«Дзякуючы парку, мы падштурхнулі і адукацыю ў гэтым кірунку, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У мяне выклікае непакой, што ў нас ужо, напэўна, празмерны перакос у ІТ-сферы, у падрыхтоўцы спецыялістаў у гэтым плане. Аднак пытанне можна рэгуляваць: не будзе попыту — не будзе і падрыхтоўкі. А калі ёсць попыт — значыць, рыхтуюцца спецыялісты. Маладыя людзі хочуць працаваць айцішнікамі. Таму, з якога боку ні паглядзі, усё-такі Парк высокіх тэхналогій — фішка незалежнасці маладой дзяржавы. Ён павінен існаваць».

### Працаваць на краіну

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў красавіку гэтага года быў падпісаны Указ № 136 «Аб органе дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця і пытаннях інфарматызацыі». Парку высокіх тэхналогій даручалася стварыць базу даных кампетэнцый рэзідэнтаў і вызначыць парадак іх прыцягнення да працэсаў лічбавізацыі галін эканомікі. Прэзідэнт пацікавіўся вынікамі гэтай работы. Таксама кіраўніка дзяржавы хвалюе, як працуе назіральны савет Парка высокіх тэхналогій, наколькі кантралюецца сітуацыя ў ПВТ і як далей будзе ажыццяўляцца яго работа. «Мы не павінны бачыць толькі станоўчае — мы павінны бачыць і недахопы — для таго, каб своечасова рэагаваць», — пераканаы кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

## Меркаванне парламентарыя

**Валянцін СЕМЯНЯКА:**

# «ГЭТА ЎНІКАЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ ПАДЫХОД ДА САПРАЎДНАГА НАРОДАЎЛАДДЗЯ»



Фота БелТА.

**Гутарка са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцінам Семянякам пра адаптацыю законаў да абноўленай Канстытуцыі, актыўнасць беларускага грамадства і ўмовы ўстойлівасці беларускай дзяржавы.**

СТАР. 3

## Спажывец

# ПРЫГОЖА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

## Што прапануюць у буціках з беларускімі брэндамі?

**Пагадзіцеся, купляючы беларускае, усе мы трошкі ганарымся сабой. Хоць «ганарымся» — няправільнае слова. Хутчэй, гэта тое пачуццё, як у дзяцінстве, калі ведаеш, што робіш правільна і добра.**

У дадзеным выпадку — падтрымліваеш айчыннага вытворцу. Але кола беларускага, якое традыцыйна купляе сярэднестатыстычны спажывец (гэтым разам — жанчына), акрэслена для многіх даволі выразна (гаворка не аб прадуктах харчавання, тут па большасці пазіцый беларускае купляецца з задавальненнем і ад душы). Гэта касметыка (у большай ступені «дэкаратыўка», чым сродкі догляду за скурай, і пераважна — асобныя правераныя пазіцыі). Гэта калготкі і бялізна. Зразумела, дзіцячае і падлеткавае адзенне для школы да кожнага навучальнага года. Гэта — часам абутак, часам — сумачкі-пальчаткі, а таксама нейкія базавыя прадметы гардэроба. Шукаць у айчыннага вытворцы нешта гэткае ўльтрамоднае або проста класнае, што стане ключавой рэччу сезона, у чым будзеш сабе падабацца, не заўсёды ўдзячны занятак. Ёсць брэнды, якія ствараюць сапраўды стыльныя рэчы (з ужо напрацаванай гісторыяй, у якіх ёсць прыхільнікі). Але рэчы ў іх, як правіла, нятанныя ад слова «зусім» — працяй выбраць правераны часам масмаркет, дзе і знайсці тое, што шукаеш, але больш танна.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X


Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месячны.



# «Мы і далей будзем працаваць з ПВТ і выкарыстоўваць яго на карысць краіны»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такая ўвага да Парка высокіх тэхналогій з боку беларускага лідара невыпадковая. Яго стварэнне — асабістая ініцыятыва Аляксандра Лукашэнкі. Увогуле, тое, што IT-сфера стала яшчэ адной візітоўкай Беларусі, — у першую чаргу заслуга кіраўніка дзяржавы, які заўсёды падтрымліваў развіццё высокіх тэхналогій і працягвае гэта рабіць.

Гаворачы аб функцыянаванні ПВТ у цяперашніх умовах, Прэзідэнт быў шчыры: ён не чакаў, што за тры кварталы гэтага года экспарт парка наблізіцца да двух мільярдаў долараў. «Гэта высокі ўзровень, — падкрэсліў ён. — Але гэта тры кварталы, а год — чатыры кварталы. Паглядзім, як вы спрацуеце ў чацвёртым квартале».

Кіраўнік дзяржавы не хавае: не можа не радаваць, што тыя, хто рвануў за межы краіны пасля ўвядзення санкцый, пачалі вяртацца. «Вельмі многія вярнуліся назад, — заўважыў ён. — Пакаштавалі «заграніцу» на зуб, зразумелі, што ў краіне, дзе ты нарадзіўся, і павінен спатрэбіцца. Гэта добрыя тэндэнцыі. Новыя рэзідэнты, ведаю, рэгіструюцца, свае IT-прадукты ствараюць, асвойваюць новыя рынкі. Усё ўціхамірыцца. Бізнес ёсць бізнес. Вайна вайной, а бізнес сваё месца знойдзе ў свеце».

Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць праблемы, якія ёсць, а таксама меры рэагавання на іх. «Каб наша грамадства разумела, як мы ўсё ж такі далей будзем працаваць з ПВТ і выкарыстоўваць яго на карысць краіны перш за ўсё, — патлумачыў беларускі лідар. — Настаў час, вопыт ёсць, добры вопыт, трэба ўсё ж такі гэты парк паварочваць, каб ён працаваў перш за ўсё на краіну, працаваў эфектыўна».

Свой пункт гледжання на функцыянаванне ПВТ выказаў першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў, які прысутнічаў падчас рабочай сустрэчы. Па словах віцэ-прэм'ера, узрыўны рост за апошнія пяць гадоў — фактычна па экспарце Парк высокіх тэхналогій адпавядае экспарту калійных угнаенняў — гэта сур'ёзны ўклад у экспарт і сальда. «Акрамя таго, што гэта новая эканоміка, якая была створана вамі (Прэзідэнтам. — **«Зв».**) на маладой беларускай зямлі, яны рэальна напрацавалі кампетэнцыю, — удакладніў Мікалай Снапкоў. — Гэта рэальна значная стуктура, якая здольна выконваць любыя задачы на сусветнай прасторы. Не толькі і не столькі ў Беларусі, хоць яны (ПВТ. — **«Зв.»**) таксама з'яўляліся не тое што падмуркам, але па меншай меры драйверам, трыгерам таго, што ў нас адпаведных кампетэнцый развіваліся ў прамысловасці, у рэальным сектары эканомікі, ды і ўсюды».

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

### НА КАРЫСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ

У размове з журналістамі **дырэктар Парка высокіх тэхналогій Усевалад ЯНЧЭЎСКІ** заўважыў, што самы галоўны пасыл, які гучаў з вуснаў кіраўніка дзяржавы, — роўна такі ж, які быў на працягу шматлікіх гадоў. «Парк развіваўся менавіта таму, што былі стабільныя ўмовы яго існавання, — удакладніў ён. — Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз пацвердзіў сваю вельмі дакладную, простую і непарушную пазіцыю: Рэспубліка Беларусь заўсёды падтрымлівала новыя тэхналогіі, Парк высокіх тэхналогій, і гэта захоўваецца».

Яшчэ адзін важны пасыл, які агучыў Аляксандр Лукашэнка, — патрэбна абавязкова глядзець у будучыню, каб і праграмісты, і кампаніі маглі спакойна працаваць, ствараць, ісці наперад.

Па словах Усевалада Янчэўскага, Парк высокіх тэхналогій хавалі ўжо шмат разоў. «І што ўсе з'ехалі, і што няма кампаній, увогуле IT-галіны няма, — удакладніў ён. — Тым не менш Парк высокіх тэхналогій па-ранейшаму ёсць і будзе. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, пераважная частка кампаній працуе ў Рэспубліцы Беларусь, рэгіструюцца новыя кампаніі».

Аб гэтым сведчаць і лічбы. Экспарт ПВТ у гэтым вельмі складаным годзе перавышае паказчыкі 2020 года. «За дзевяць месяцаў перавышае два мільярды долараў, — канкрэтызаваў дырэктар. — Да канца года будзе яшчэ больш». Па яго словах, у свеце ведаюць Беларусь і па IT-галіне. «Ведалі, ведаюць і будуць ведаць, — падкрэсліў Усевалад Янчэўскі. — Парк, створаны Прэзідэнтам, быў адным з гонараў нашай краіны, ён ім і застанецца і яшчэ парадуе краіну і здзівіць свет».

Як паведаміў **намеснік дырэктара Парка высокіх тэхналогій Кірыл ЗАЛЕСКІ,** рэжым функцыянавання Парка высокіх тэхналогій не мяняецца. «Мы зыходзім з таго, што адкрываем новае дыханне для нашага парка, — заўважыў ён. — За апошнія два гады наш IT-сектар, нашы айцішнікі пабывалі ў розных сітуацыях, большасць шматтысячнай арміі айцішнікаў працавала на эканамічны дабрабыт нашай краіны. Былі і тыя, хто праявіў сябе не з самага добрага боку. Сёння мы гэтую старонку перагортваем і працягваем працаваць на стварэнне, умацаванне эканамічнай магутнасці нашай дзяржавы. Сёння Парк высокіх тэхналогій сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі вядзе карпатлівую работу па ўкараненні беларускіх IT-распрацовак унутры краіны на карысць нашай эканомікі. У гэтым кірунку будзем свае намаганні толькі нарошчваць».

---

Блізкая ўлада

# КАПРАМОНТ, АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ, ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ...

## Наталля КАЧАНАВА правяла асабісты прыём грамадзян



Фота БелТА.

**Старшыня Савета Рэспублікі сёння праводзіць асабісты прыём грамадзян. Асноўнымі пытаннямі, з якімі людзі звярнуліся да Наталлі Качанавай, сталі нядобраякасныя рамонты дамоў, самавольнае будаўніцтва гаражоў, якое перашкаджае суседзям, долевае будаўніцтва. Таксама падчас асабістага прыёму да Старшыні Савета Рэспублікі звярнуліся з просьбамі выдзялення арэнднага жылля, дапамогай у працаўладкаванні і выплаце пенсій.**

На асабісты прыём таксама былі запрошаны прадстаўнікі гарвыканкамаў, главы адміністрацый раёнаў і супрацоўнікі ЖКГ, каб пастаўленыя грамадзянамі пытанні вырашыліся ў найхутчэйшыя тэрміны.

— Я папярэджваю: калі праблемы, з якімі звярнуліся людзі, не будуць вырашаны, службовыя асобы, якія за гэта адказваюць, будуць прыцягнуты да адказнасці. Такія пытанні павінны вырашацца на месцах, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Напрыклад, мінчанка Кацярына Васільеўна расказала, што ў выніку пражывання ў кватэры з цвіллю атрымала захворванні суставаў. Згодна з заключэннем медыкаў, дыягназ атрыманы менавіта з-за жыллёвых умоў.

Яўген Якаўлевіч звярнуўся з просьбай дапамагчы ў падтрымцы фізічнага стану свайго ўнука, які мае дыягназ, звязаны з расстройствам аўтыстычнага спектра. Але да гэтага часу сям'я не можа знайсці спецыялістаў, якія б дапамаглі вырашыць праблему.

— Я падключу ўсіх, каго трэба, — адрэагавала Наталля Качанава. — Зыходзячы з падобных зваротаў, быў створаны кансультатыўны савет, у які ўваходзяць міністр адукацыі, міністр аховы здароўя, супрацоўнікі РНПЦ і медыкі. Якраз на мінулым тыдні мы правялі пасяджэнне савета менавіта па гэтай праблеме. Адправім вашага хлопчыка да лепшага спецыяліста.

Усе агучаныя пытанні Старшыня Савета Рэспублікі ўзяла на кантроль. Больш падрабязна аб асабістай сустрэчы Наталлі Качанавай з грамадзянамі чытайце ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 19 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў Вялікабрытаніі дасягнула 41-гадовага максімуму




Гадавая інфляцыя ў Вялікабрытаніі ў кастрычніку дасягнула найвышэйшага ўзроўню за 41 год, склаўшы 11,1 працэнта. Аб гэтым паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на Упраўленне нацыянальнай статыстыкі Злучанага Каралеўства. Раней эксперты, апытаныя Reuters, прагназавалі, што дадзены паказчык у кастрычніку ўзрасце да 10,7 працэнта. Месяц раней інфляцыя ў Вялікабрытаніі складала 10,1 працэнта. Адзначаецца, што такі высокі паказчык найперш звязаны з ростам цэн на энерганосьбіты і прадукты харчавання. Згодна са статыстычнымі данымі, цэны на прадукты харчавання і безалкагольныя напоі ў кастрычніку раслі самымі хуткімі тэмпамі з 1977 года. Раней у Банку Англіі заявілі, што Вялікабрытанія ўжо сутыкнулася з рэцэсіяй, якая можа працягнуцца да двух гадоў.

### Кампанія Amazon звольніць каля дзесяці тысяч супрацоўнікаў




Аб гэтым паведаміў тэлеканал CNBC. «Кампанія апавясціла работнікаў некалькіх падраздзяленняў, у тым ліку Alexa і воблачнага гульнявога сэрвісу Luna, аб тым, што іх звальняюць», — адзначае тэлеканал, спасылаючыся на апублікаваныя пасты супрацоўнікаў Amazon у сацыяльнай сетцы LinkedIn. Як піша газета The New York Times, плануецца звольніць каля дзесяці тысяч чалавек, што стане самым вялікім скарачэннем рабочых месцаў за 28-гадовую гісторыю кампаніі. У 2001 годзе Amazon скарціла 1,3 тысячы рабочых месцаў. Газета The New York Times звязвае надыходзячыя звальненні з чаканнем рэцэсіі ў ЗША. За апошнія тыдні аб маштабных скарачэннях заявілі таксама Twitter і Meta.

### Турэцкія атэлі на наступнае лета ўзнімуць цэны на 30—50 працэнтаў

Гэта звязана з высокім попытам, прадуктовай інфляцыяй і павышэннем заробкаў супрацоўнікаў, паведамілі «Інтэрфаксу» прадстаўнікі гасцінічнага бізнесу краіны. «У Турцыі сёлета высокая інфляцыя (яна ўпершыню за 25 гадоў перавысіла 85 працэнтаў. — **Рэд.**), на некаторыя прадукты цэны ўзраслі ў пяць разоў. Кубак кавы падаражэў з 15 лір да 55 (каля 7,5 рубля. — **Рэд.**). Дзяржава таксама павысіла мінімальныя зарплаты работнікаў. Таму мы вымушаныя на наступны год павышаць цэны, каб кампенсаваць выдаткі», — сказаў прадстаўнік атэля Seven Seas Gravel Select у Кемеры Гюнай Шабан. Паводле яго слоў, на наступны летні сезон цэны вырастуць у еўра не менш чым на 50 працэнтаў. «Цяпер нумары па акцыях ранняга браніравання можна купіць са скідкай да 30 працэнтаў, гэта значыць бягучае павышэнне складае 20 працэнтаў», — сказаў Шабан.

# «ГЭТА ЎНІКАЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ ПАДЫХОД ДА САПРАЎДНАГА НАРОДАЎЛАДДЗЯ»

## «Да апошняга моманту ішла нарада з народам»

***— Валянцін Міхайлавіч, на вашу парламенцкую дзейнасць прыпаў унікальны вопыт работы над праектам абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Раскажыце пра галоўныя вынікі таго вопыту.***

— Я працаваў у складзе Канстытуцыйнай камісіі. І калі мы працавалі над зместам Асноўнага Закона, практычна на кожным пасяджэнні звярталі ўвагу калег на тое, што нам трэба ўнесці змяненні, якія ніякім чынам не пагоршаць сітуацыю ў краіне, каб не адмовіцца ад таго, што працуе, што даказала сваю эфектыўнасць. Калі мы ўносім змяненні ў заканадаўства, то неабходна разумець іх наступствы, тое, як яны будуць працаваць.

Асноўным момантам, які дазволіў рэалізаваць такі падыход, стала тое, што на ўсіх этапах падрыхтоўкі праекта абноўленай Канстытуцыі мы, дэпутаты, актыўна ўзаемадзейнічалі з нашымі выбаршчыкамі, з працоўнымі калектывамі, грамадзянамі, грамадскімі аб'яднаннямі, палітычнымі партыямі. Таму што яшчэ задоўга да стварэння Канстытуцыйнай камісіі Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве і мясцовым самакіраванні акумулявала ўсе прапановы, а мы сабралі іх каля пяці тысяч, размеркавалі па ўсіх раздзелах, і калі Канстытуцыйная камісія працавала, методыка была такая: спачатку аналізавалі тое, што прапаноўваюць грамадзяне, а потым выслухоўвалі прапановы членаў Канстытуцыйнай камісіі. І да апошняга моманту, да вынясення на рэферэндум, ішла нарада з народам.

Гэта вельмі важна, таму што асобныя пазіцыі, якія Канстытуцыйная камісія палічыла неабходным унесці, людзі не падтрымалі, і ад іх прыйшлося адмовіцца. У прыватнасці, палажэнне аб тым, што грамадзяне абавязаныя клапаціцца аб уласным здароўі. Гэтак прапанавалі людзі, але калі пайшло больш шырокае абмеркаванне, узнікла занепакоенасць, што такое палажэнне можа прывесці да прымусовых дзеянняў і адмовы ад бясплатнага медыцынскага абслугоўвання. Таму на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы дадзенае пытанне ўзнялі, Прэзідэнт прапанаваў Канстытуцыйнай камісіі яшчэ раз падумаць, і мы вырашылі адмовіцца ад такой фармулёўкі і замянілі яе іншай: «грамадзяне Рэспублікі Беларусь клапоцяцца аб уласным здароўі». Гэта заклік да больш абачлівага стаўлення да ўласнага здароўя.

Сёння, у адпаведнасці з пераходнымі палажэннямі Асноўнага Закона, які быў прыняты на рэферэндуме, стаіць задача імплементацыі нацыянальных Канстытуцыі ў заканадаўчыя акты. Да лютага 2024 года мы павінны такую работу завяршыць. Па нашых падліках, каля 100 законапраектаў неабходна перагледзець. Патрабаванне Прэзідэнта: якасць заканатворчай работы павінна быць высокай, каб законы не перапісваліся штогод. Гэта нас абавязвае не толькі ўлічваць неабходнасць імплементацыі нормаў Канстытуцыі ў заканадаўства, але і тыя рэаліі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

**Грамадскае абмеркаванне і інфармаванне па праекце закона аб УНС і выбарчым заканадаўстве ў працоўным калектыве Мінскага аўтамабільнага завода. У абмеркаванні законапраектаў узялі ўдзел кіраўніцтва прадпрыемства і буйных структурных падраздзяленняў, прадстаўнікі працоўнага калектыву.**

практыкі прымянення законаў, якія на сённяшні дзень ёсць. Работа тут вялікая, важная і грунтоўная.

І цяпер, калі мы працуем над згаданымі заканадаўчымі актамі, вядзём нараду з народам. Увогуле, у практыцы дэпутата Палаты прадстаўнікоў кожны законапраект, які з'яўляецца ў ніжняй палаце парламента, да таго, як вынесць яго ў Авальную залу, мы абмяркоўваем яго ў акрузе, раімся з людзьмі. Гэта дазваляе пазбегнуць пэўных памылак, бо мы не можам усё прадбачыць. Самы яскравы прыклад — абмеркаванне двух рэзанансных законапраектаў: «Аб Усебеларускім народным сходзе» і Выбарчага кодэкса. Калі мы аналізавалі прапановы па змяненнях у Канстытуцыі, большасць іх датычылася менавіта гэтых дзвюх галін дзейнасці нашай дзяржавы. Людзі цікавіліся, як будзе працаваць орган, які цяпер атрымлівае канстытуцыйны статус. Падзеі 2020 года прыцягнулі ўвагу да выбарчых працэсаў. Важна, што практыка ўсенароднага абмеркавання Асноўнага Закона цяпер транспалюецца на заканадаўчыя акты.

***— Над якімі законапраектамі працуе ваша камісія ў дадзены момант?***

— На разглядзе ў нашай Пастаяннай камісіі знаходзіцца законапраект аб змяненнях у Закон «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь». Гэта мой аўтарскі закон у сааўтарстве з членам Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве і мясцовым самакіраванні Аленай Станіславаўнай Патапавай і ў цесным узаемадзеянні з Саветам Рэспублікі. Мы яго падрыхтавалі і правялі першае чытанне. Ён цягне за сабой змяненні ў астатнія законы, у прыватнасці, у Закон «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», ёсць узаемасувязь з законамі, якія рэгламентуюць мясцовае самакіраванне, з Выбарчым кодэксам і іншымі.

Асноўныя навелы вынікаюць з Канстытуцыі: пяцігадовая кадэнцыя дэпутацкага корпуса, выбары ў адзіны дзень галасавання, пераразмеркаванне паўнамоцтваў ад Прэзідэнта да парламента, ад парламента да Усебеларускага народнага сходу і гэтак далей.

Таксама адаптуем да змен, якія ўжо адбыліся ў заканадаўстве, Закон «Аб барацьбе з карупцыяй», адпаведны праект прайшоў першае чытанне. Над гэтым дакументам працуе Пастаянная камісія па нацыянальнай бяспецы, але мы яго ўлічваем у сваіх законапраектах, паколькі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі з'яўляюцца дзяржаўнымі служачымі, на іх распаўсюджваюцца нормы прыведзенага закона, мы іх улічылі.

Вялікая цікавасць і да законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання», які цяпер рыхтуецца да другога чытання. Я ў сваёй акрузе абмяркоўваў яго змест і пачуў дзве вельмі слушныя прапановы. Першая — дазволіць ва ўмовах складанай эпідэмічнай сітуацыі па пытаннях, якія не маюць першачарговага значэння, прымаць рашэнні прэзідыума абласнога, раённага Савета шляхам збору подпісаў. Другая — рэгламентаваць правядзенне сесій у рэжыме анлайн, што ўжо з'яўляецца практыкай і патрабуе адлюстравання ў законе.

Днямі мы правялі пасяджэнне рабочай групы па гэтым законапраекце і дамовіліся пра пашырэнне паўнамоцтваў дэпутатаў сельскіх Саветаў, раённага і абласнога ўзроўняў у плане ўзгаднення кандыдатур на пасады кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў межах тэрытарыяльнай адзінкі. У адносінах да сельскіх Саветаў гэта навела, таму што даюцца паўнамоцтвы сельскім Саветам узгадняць кандыдатуры ўсіх кіраўнікоў, у тым ліку сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці. Таксама сельскім Саветам даецца права адкрыцця і закрыцця сацыяльных устаноў — устаноў адукацыі, культуры і гэтак далей, што вельмі актуальна сёння. Такім чынам мы рэалізоўваем грамадскі запыт на павышэнне паўнамоцтваў мясцовых органаў кіравання і самакіравання.

Законапраект замацоўвае асобы статус горада Мінска ў адносінах да органаў мясцовага самакіравання: будзе створаны Мінскі гарадскі каардынацыйны савет — грамадскі орган, які будзе каардынаваць работу калегіяльных органаў тэрытарыяльнага самакіравання ў сталіцы.

У найбліжэйшы час чакаем унясення Выбарчага кодэкса ў нашу камісію і будзем над ім працаваць. Там будуць замацаваны нормы аб пяцігадовым тэрміне кадэнцыі дэпутатаў і Прэзідэнта, пра адзіны дзень галасавання, узроставы цэнз для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах — не менш за 40 гадоў для кандыдата, абмежаванне двума тэрмінамі і іншыя асаблівасці выбарчага працэсу, якія дыктуе практыка.

## «Практычна кожны чалавек быў пачуты»

***— Наколькі дакладна людзі разумеюць ролю Усебеларускага народнага сходу?***

— Многія пытанні былі знятыя яшчэ на этапе анансавання надання УНС статусу канстытуцыйнага органа. Цяпер мы адказваем на пытанні, якія канкрэтызуюць дадзеную тэму: як будуць ажыццяўляцца выбары, хто можа быць членам УНС, які будзе апарат, якія пастаянна дзеючыя органы, як часта будзе збірацца, і падобныя. У законапраекце ўсё гэта расшыфроўваецца, і тое людзей цікавіць.

Беларусы ведаюць, што такое Усебеларускі народны сход. Ён стаў нашай рэальнасцю. Гэта тая сітуацыя, калі заканадаўцы рэагуюць на практыку. Прайшло шэсць такіх сходаў, і кожны з іх унёс пэўны ўклад у гісторыю дзяржаўнага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Сходы станавіліся кансалідуючым органам, мабілізавалі нацыю на вырашэнне найбольш важных пытанняў у калякрызісныя моманты. У іншыя часы Сход прымаў рашэнні, якія носяць перспектыўны характар, што адлюстравана ў Канстытуцыі і будзе адлюстравана ў законе.

Задача парламента: стварыць заканадаўчую аснову пад практыку. Гэта, з аднаго боку, лягчэй, бо ёсць практыка, з другога — больш складана, бо трэба развіваць, узнімаць на новы ўзровень і, самае галоўнае, вызначыць месца гэтага органа ў сістэме дзяржаўных органаў улады. Мы тут з'яўляемся першапраходцамі, як і ва ўсенародным абмеркаванні. Гісторыя не ведае прэцэдэнтаў, каб так шырока абмяркоўвалі праект Канстытуцыі, практычна кожны чалавек быў пачуты, яго прапанова была агучана альбо на дыялогавай пляцоўцы, альбо ў парламенцкім асяроддзі, альбо на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі, альбо нават на ўзроўні Прэзідэнта.

Гэта ўнікальны беларускі падыход да сапраўднага народаўладдзя. Людзей захапляе магчымасць для кожнага стаць дэлегатам УНС. Траціна будзе абраная па пасадзе. Трацiна — сесіямі мясцовых Саветаў. У 2024 годзе плануецца выбарчая кампанія, падчас якой кожны можа вылучыць сваю кандыдатуру з перспектывай стаць дэлегатам Сходу. Нарэшце, трацiна будзе абрана з грамадзянскай супольнасці: ад грамадскіх аб'яднанняў. Прапануецца, што гэта будуць аб'яднанні, якія маюць не менш за 100 тысяч членаў, прадстаўніцтвы ва ўсіх абласцях і не менш як у траціне раёнаў краіны. Такім чынам стымулюецца актыўнасць грамадзян. Атрымліваецца, што дзве трацiны ўдзельнікаў УНС — людзі з месцаў: дэпутаты мясцовых Саветаў, якія робяць справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі, і прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў. Гэта і ёсць сапраўдная рэалізацыя прынцыпу народаўладдзя — не эфемернага, не фармальнага, а рэальнага народаўладдзя ў прыняцці лёсавызначальных рашэнняў для дзяржавы.

Паўнамоцтвы УНС вельмі шырокія, пачынаючы ад увядзення надзвычайнага становішча і заканчваючы вынясеннем імпічменту Прэзідэнту. Каб рэалізаваць гэтыя паўнамоцтвы, патрэбныя людзі з высокай грамадзянскай адказнасцю, падрыхтаваныя.

Практыка пакажа, як будуць узаемадзейнічаць паміж сабой органы ўлады. Сёння мы ў Канстытуцыі і законапраектах вельмі дакладна вызначаем паўнамоцтвы кожнага і закладваем механізмы, якія дазволяць, з аднаго боку, іх кампенсаваць, з другога — стрымліваць памкненні па-за межамі закона.

Я ўскладаю вялікія надзеі на УНС, бо мы не проста ўзаконьваем тое, што ўжо добра працуе, але працуем на перспектыву. На практыцы рашэнні Усебеларускага народнага сходу былі абавязковымі для ўсіх органаў улады, таму што гэта праграмныя дакументы, цяпер тое будзе прапісана ў законах, у тым ліку адказнасць. Людзі разумеюць неабходнасць гэтага.

Акрамя таго, гэта перспектыва, якая дазваляе спрагназаваць развіццё нашых дзяржаўных інстытутаў, іх узаемадзеянне і забяспечыць высокую жыццяздольнасць дзяржавы і дзяржаўнага кіравання.

***— Як на падрыхтоўцы законапраектаў адбіваецца пільная ўвага да іх з боку кіраўніка дзяржавы?***

— Прэзідэнт заўсёды дае магчымасць для дыскусіі, ніколі не навязвае свае думкі. Ён уважліва ставіцца да розных пунктаў гледжання. Уласнае меркаванне абгрунтоўвае. У выніку заканатворца можа выбіраць тое, што найлепш падыходзіць.

На сустрэчах з членамі Канстытуцыйнай камісіі кіраўнік дзяржавы апеляваў да свайго парламенцкага досведу. Такое экспертнае суправаджэнне вопытнага палітыка вельмі карыснае. Ён заўсёды кажа: першае — парайцеся з народам, другое — улічыце міжнародны вопыт. Гэта дарагога варта.

## «Прыклад шчырай палітыкі»

***— Наколькі сам народ гатовы браць удзел у абмеркаванні законапраектаў?***

— У апошнія гады інтарэс да палітычных працэсаў у беларусаў вырас. Людзі разумеюць, што ад таго, наколькі мы якасна пабудуем нашу дзяржаву, правядзём канстытуцыйныя перамены, залежыць лёс краіны. Людзі не проста цікавяцца, яны адчуваюць смак да ўдзелу ў такіх працэсах. Палітычная адукаванасць беларускага грамадства значна вырасла. Рэальнасць перасягнула нават самыя смелыя прагнозы наконт удзелу людзей у рэферэндуме 2022 года.

Беларусь паказвае прыклады цывілізаванага падыходу да ўзаемадзеяння ўлады і народа. Паказвае прыклад шчырай палітыкі. За такой палітыкай — адкрытай, міралюбнай — будучае. Час усё расстаўць па сваіх месцах. Людзі цяпер нярэдка пытаюцца: што рабіць падчас сусветнага эканамічнага, палітычнага і ваеннага крызісу? Я заўсёды заклікаю браць прыклад з кіраўніка нашай дзяржавы — спакойна, удумліва працаваць на даручаным участку, гадаваць дзяцей, узаемадзейнічаць з суседзямі, планаваць жыццё і не чакаць, што нехта нешта нам дасць. Толькі ўласная праца, актыўнасць, добразычлівасць, шчырасць дазваляюць супрацьстаяць сучасным выклікам. Яны значныя, але ўстойлівасць нашай дзяржавы дастатковая, і гэта даказваюць падзеі апошніх гадоў. Важна захоўваць адзінства і супольнасць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ПРЫГОЖА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Але так ці інакш, сёння ёсць прыгожыя крамы беларускага дызайнерскага адзення. Некалькі новых адкрылася ў Мінску гэтым летам. І, як пішуць тыя, хто там пабываў, цэны на многія пазіцыі ў іх супастаўляльныя з любімымі нашымі модніцамі Zara і Mango. Улічваючы, што дызайнерскае адзенне — звычайна дарагая гісторыя, бо плаціш за эксклюзіў. Акрамя таго, такія крамы, як правіла, арганізоўваюцца як прыгожая дызайнерская прастора з асаблівым настроем. Позняй беларускай восенню, калі цяпла чакаць не даводзіцца, а да Новага года яшчэ далёка — якраз тое, што трэба, каб настрой стаў лепшым, таму сходзім і паглядзім. І раскажам пра цэны.

## Усё і адразу

Адно з галоўных модных адкрыццяў (у прамым і пераносным сэнсе) гэтага лета ў сталіцы размешчана ў гандлёвым цэнтры Dana Mall, першы паверх, уваход асобны. На прасторы We are brands — корнеры найбольш папулярных і вядомых беларускіх брэндаў: LSD, MUA, Murmur, 1unomas1uno, Mstefa, Toshe і іншыя. Брэндаў тут прапанавана некалькі дзясяткаў. Большую частку звычайны спажывец, хутчэй за ўсё, не ведае, хоць ёсць тыя, якія на слыху, нават калі вы ніколі не бывалі на модных паказах. Чаму сюды варта наведацца? Хоць бы для таго, каб проста ацаніць сітуацыю з беларускім дызайнам адзення і пазнаёміцца з айчыннымі брэндамі.

Трэба сказаць, сітуацыя годная — без усялякіх нацяжак. Калі вы выпадкова або наўмысна бачылі модныя паказы, магчыма, для вас стане адкрыццём, што айчынная мода стварае вопратку не толькі ў стылі «я мастак, я так бачу», якую наўрад ці можна надзець па-за подыумам, але і цалкам практычныя рэчы, якія можна насіць. І якасныя, абавязкова, — гэтага ў беларускага вытворцы не адняць. Дарэчы, цэны пры гэтым у некаторых брэндаў не нашмат вышэйшыя за мас-маркет.

Арганізавана ўсё прыгожа і разумна. Кожны куток мае сваіх кансультантаў — і аб брэндзе раскажуць, і падбяруць нешта прыдатнае менавіта да вашай фігуры. Лічыце, пабывалі ў стыліста.

— Працуем з лета: наша прастора адкрылася ў сярэдзіне жніўня. Усё — беларуская вытворчасць, і гэта вельмі крута. Добрая якасць і кошты больш-менш адэкватныя, — тлумачыць прадавец.



**У многіх брэндаў ёсць свае аматары.**

Чым дызайнерскае адзенне адрозніваецца ад мас-маркета?

— Тут шмат базавых мадэляў, якія ёсць і ў мас-маркеце, і ў нас. Але ёсць і дызайнерскія мадэлі — можна знайсці нешта цалкам эксклюзіўнае. У любога дызайнера ёсць такія рэчы, — кажа кансультант брэнда Allma. — Напрыклад, вось такіх жакетаў з норкай няма больш нідзе ў Мінску. Натуральная норка і твід. Мех пафарбаваны ў яркія адценні.

Дызайнераў у Беларусі шмат, яны таленавітыя, і ўбачыць усё і адразу — цікава: у We are можна хадзіць, як на экскурсію.



**Тут можна выпіць кавы і набыць дызайнерскія ўпрыгажэнні — напрыклад з тысячагадовага дубу.**

— Сюды шмат пастаянных кліентаў прыходзіць. Мы працуем са жніўня, але ў многіх брэндаў ёсць свае прыхільнікі. У нас брэнд запушчаны ўжо восем гадоў таму, — расказала кансультант брэнда MUA. — І ў яго ёсць уласныя кліенты.

Сярод пакупнікоў таксама шмат прыезжых, распавялі дзяўчаты. Цяпер часцей гэта расіяне. У асноўным у We are прапанаваныя мінскія дызайнеры. Ёсць брэсцкія: Брэст у Беларусі — модная сталіца, як без іх? Ёсць таксама брэнды з Віцебска. Цэны такія: фіялетавы (гэта адзін з трэндавых колераў сезона) касцюм ад Allma — пінжак і штаны — 450 рублёў, доўгае крэмавае эка-футра ад MUA — 399 (ёсць таксама ў мятным колеры, але пакупнікі аддаюць перавагу ўніверсальнаму «крэмаваму» варыянту). Засталіся толькі памеры з 46-га, маленькія — раскупілі.

— Такое футра вытрымлівае да мінус 20 градусаў, таму дзяўчаты гэты варыянт разглядаюць на зіму, — расказалі кансультанты.

Далей па цэнах: экафутра — у сярэднім 400-470, паліто ў самых розных вырашэннях ёсць амаль у кожнага брэнда, можна знайсці нават за 350 рублёў, хоць у асноўным 400-450. Трыкатажныя касцюмы — ад 200 да 300. Вельмі шмат касцюмаў са штанамі з пінжакамі — і двойкі, і тройкі, аверсайз, класіка і «з мужчынскага пляча» — якраз тое, што трэба, каб знайсці ўласны варыянт. Цэны розныя. У сярэднім спатрэбіцца мінімум 500 рублёў. Затое набытак універсальны.

Ёсць, вядома, варыянты больш дарагія. Затое відаць, за што плаціш. Напрыклад, касцюм-тройка ад The Suitter улюбляе ў сябе адразу.

— Не абавязкова браць касцюм з жакетам аверсайз, вазьміце ў памер — і гэта набыццё надоўга, — раіць кансультант Надзея. — Апранулі ўніз блузку — і вось у вас дзелавы стыль. Надзелі кеды, футболку і камізэльку — і вы ў трэндзе. Надзелі абцасы і вадалазку — і вы ў класіцы.

А наогул, тлумачаць прадаўцы, на тым жа рэчавым рынку або ў інтэрнэт-крамах цэны, вядома, ніжэйшыя, але рэч хутка страціць вонкавы выгляд — прытым, што часта і першапачатковага яго, можна сказаць, не мела. А беларускае дызайнерскае адзенне пакуль адносна недарагое ў сваім сегменце.

— Прапануецца дадаць не так шмат і хадзіць у рэчы, якая — адразу відаць — выглядае стыльна і якасна. І не страціць выгляд у працэсе носкі. Дзе вы бачылі воўну такой апрацоўкі?

Гаворка — аб чорным паліто ад The Suitter.

— Гэта не «шынель», не прымешкі — стапрацэнтная воўна добрай апрацоўкі. Пакратайце, яна ж, як шоўк! Гэта ж амаль Max Mara, а цана 430 рублёў! Сапраўдная якасць і добрае лякала па-асабліваму зрокава ўспрымаюцца... «Гэта паліто — мая любоў, — кажа суразмоўца. — Проста радуюся, калі яго хтосьці купляе. Яно лаканічнае, ідэальнай даўжыні, стрыманае, «з мужчынскага пляча» — упішацца ў любы стыль, і пад світшоты, і пад швэдры».

Дарэчы, аб швэдрах. Швэдры-аверсайз, адзін з галоўных трэндаў гэтай зімы, тут можна знайсці правільныя — пража і сілуэт не зробяць з вас «мядзведзяня», а падкрэсляць жаноцкасць і далікатнасць, як і мяркуе трэнд. Мадэлі ад MIA з высокім горлам абыдуцца ў 170 рублёў, без гарлавіны-стойкі — 150.

Яшчэ прастора прапануе шмат класных сумак з натуральнай скуры, ёсць дызайнерская біжутэрыя. Прадугледжана сістэма балаў, якімі ўжо з другой пакупкі можна аплачваць частку чэка. І ў цэлым, усё вельмі ярка, прыгожа і святочна — а гэта ж і ёсць галоўнае прызначэнне моды: упрыгожваць жыццё.

## А калі больш багемна?

Але наогул, дызайнерская мода, напэўна, патрабуе невялікіх крамачак гэткага «багемнага фармату». Для паўнаты карціны пабываем і ў такіх. Напрыклад, «Vershy крама» таксама адкрылася не так даўно, і яна якраз такога фармату. Гэта не «партал» у свет дызайнерскай думкі для ўсіх і кожнага (як прастора ў Dana Mall), а, хутчэй, прадстаўнік таго напрамку, які падкрэслівае: мода — у першую чаргу мастацтва. Размешчана крама на нефармальнай Кастрычніцкай, і там ёй самае месца. Дызайн выглядае выдатна — вінтажная мэбля, стыльнае афармленне сцен. Уваход праз утульную аднайменную кавярню. Пакуль на продаж у Vershy store няшмат, у асноўным гэта ўпрыгажэнні. Такія дызайнерскія-дызайнерскія, акцэнтныя і вельмі «з характарам». Акрамя аксесуараў беларускіх мастакоў ёсць упрыгажэнні ад «калег па цэху» з іншых краін — Расіі, Грузіі, Украіны. З айчынных запомніліся вырабы з моранага дубу ад Label D з натуральным жэмчугам. Дуб да таго, як трапіць у рукі дызайнера, праляжаў у зямлі (ці ў вадзе?) тысячы гадоў, да кожнага вырабу аб гэтым прыкладзены сертыфікат. Запомніліся таксама стыльныя аксесуары з японскіх пацерак з напаўкаштоўнымі камянямі і перламутрам. І «базавы» супрэматызм у чорных і чырвоных тонах — кольцы і завушніцы. Каштуе ўсё дорага (у сярэднім трэба мець з сабой рублёў 150), але гэта ручная праца — для тых, хто разумее. Не разумееце? Тады вас правядуць уздоўж вітрын, раскажуць аб кожным вырабе, і нават калі нічога не купіце, будзе цікава. З «гасцей» засталіся ў памяці грузінскія мона-завушніцы ад Tati York — выглядаюць пяшчотнымі і бязважкімі, але створаны з асабліва трывалага сплаву (як падшыпнікі на аўтамабілі, растлумачылі мне) — чым не сімвал сучаснай жанчыны?



**Шмат класных сумак ад айчынных дызайнераў.**

Тут мы таксама пагаварылі з дызайнерам Ксеніяй пра тое, «чаму дызайнерскае — гэта заўсёды дорага».

— Напрыклад, калі гэта датычыцца адзення — лякала дызайнер стварае з нуля. На гэта спатрэбіцца шмат сіл і часу. Для ідэальнай кашулі трэба не адно лякала стварыць і не адзін раз выраб пашыць. Матэрыял — нават тая ж бавоўна — таксама бывае розны.

Дызайнерскія рэчы адрозніваюцца ад мас-маркета менавіта «пасадкай на фігуры» — быццам бы, фасоны падобныя, але ў адным вырабе вы будзеце выглядаць каралевай, а ў другім — «ну, так».

Выбар адзення ў Vershy store пакуль невялікі, але асартымент будзе пашырацца. Можна набыць капелюшы, сумачкі (нейлон, сталь, нікель і мерсерызаваная бавоўна), пальчаткі ручной работы. Акрамя таго, тут вам прапануюць кубачак кавы, па вечарах паказваюць кінакласіку, і наогул, прыходзіць сюды можна, як у госці да сяброў. Што пазняй восенню асабліва каштоўна.

Калі вы не раз праязджалі міма Кальварыйскай, 21 і так ні разу туды і не зайшлі — самы час зрабіць гэта цяпер. Нейкія прамысловыя будынкі — ці то дэпо, ці то фабрыку — пару гадоў таму добраўпарадкавалі, і цяпер там, паблізу ад метро «Маладзёжная», насупраць «Кароны», стыльны квартал з назвай К-21. Да праезнай часткі звернута шыльда KFC, але акрамя банальнага фастфуду, там шмат цікавага. Напрыклад, веганскі бар, кітайская кухня, кавярні з прыгожымі і незвычайнымі інтэр'ерамі — калі хочацца пафатаграфавацца. З нядаўніх часоў — сімпатычны маленькі шоўрум дызайнерскага адзення Versia. Гэта невялікая прастора, дзе прапанаваныя брэсцкія дызайнеры і некаторыя іншыя (у тым ліку маскоўскія). Настрой тут ужо навагодні — ёсць калекцыя сукенак са штучнага шоўку для вечарын. З цікавага — сумачкі ручной работы ад беларускага брэнда Yarmolov з натуральнай скуры, а коштам менш за 200 рублёў.

Такім чынам, калі вам хочацца купіць сабе абноўку або проста паглядзець на прыгожыя шмотачкі і мілыя штучкі ад беларускіх дызайнераў, то гэтае жаданне ёсць дзе рэалізаваць. І восень лаяць не трэба: праславутая «восеньская хандра» — выдатная нагода на законных падставах парадаваць сябе, пазбегнуўшы згрызот сумлення за неапраўданае транжырства.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.**



**«Правільны» аверсайз ад MIA.**

Сядзі і глядзі

# НОВЫ ПОГЛЯД НА ЖЫЦЦЁ Ў ГЛЫБІНЦЫ

**Шоу «Я з вёскі» стартавала на тэлеканале «Беларусь 2» яшчэ ў кастрычніку. Першыя выпускі з ходу захапілі ўвагу гледачоў, аднак аўтары абяцаюць, што ўвесь дэбютны сезон будзе захапляльны ад пачатку і да канца.**

Новы каларытны праект знаёміць з беларусамі, якія свядома прамянялі горад на жыццё ў вёсцы, паверылі ў сябе і, пераадольваючы ўсе перашкоды, дасягнулі высокіх вынікаў у любімай справе. «Кожны тыдзень мы распавядаем пра тых, хто фарміруе новы вобраз беларускай вёскі. І, насуперак стэрэатыпам, мы пераканаліся: часцей за ўсё туды пераязджаюць вельмі паспяховыя людзі і зарабляюць там часта нават больш, чым айцішнікі», — адзначае **аўтар і рэжысёр праекта Герман МАЛЫШЫЦКІ**.

Цікава, што вядучым праекта стаў карэнны мінчанін Васіль Чэхаў. Ён разам са здымачнай групай ездзіць у госці да герояў праграмы і ў іх кампаніі спазнае тонкасці вясковага побыту, працы. Так, напрыклад, яго ўжо навучылі вычэсваць вярблюда, ён упершыню падаіў карову, пакасіў сапраўднай касой і спасціг майстэрства колкі дроў. Але гэта толькі пачатак. І ў новых выпусках гледачоў чакаюць натхняльныя гісторыі іх герояў, якія ўмеюць зарабляць на любімай справе, гатовыя рызыкаваць і змагацца за свае мары і мэты да апошняга. Кожны выхад шоу — захапляльная вандроўка, якая дапамагае адказаць на пытанне: чаму сучасныя маладыя людзі імкнуцца жыць у вёсцы? Глядзіце праект «Я з вёскі» на «Беларусь 2» па нядзелях днём — і пераканайцеся ў тым самі.



**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 159

**Сённяшнюю задачу склаў Вячаслаў Красічонак з Бабруйска** (*гл. дыяграму*).



**Белыя:** Крg7, Фс1, Лg5, Сb5, Cd8, Ke3, Ke5, пп. b2, f3 (9).

**Чорныя:** Крd4, Лd6, Лg2, Ce1, Cf7, Kb7, пп. d5, g3, g6 (9).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Дзве свае задачы на мат за 3 хады прапануе Віктар Жук з Брэста.

№ 1

**Белыя:** Крe8, Фf8, Kf3, пп. d5, e2, e6 (6).

**Чорныя:** Крe4 (1).

№ 2

**Белыя:** Крf3, Ла6, Cf7, Kb5, Kd4, пd2 (6).

Чорныя: Крb4 (1).

* * *

На Мемарыяле Міхаіла Чыгорына ў Санкт-Пецярбургу (228 гульцоў) Аляксей Аляксандраў заняў першае месца, Дзяніс Лазавік — пятае; месцы з дзясятага да чатырнаццатага занялі адпаведна Міхаіл Нікіценка, Вячаслаў Зарубіцкі, Андрэй Кавалёў, Кірыл Ступак і Аляксей Фёдараў, а Арцём Стрыбук фінішаваў дваццаць першы. У турніры па бліцы (244 удзельнікі) перамог Д. Лазавік, А. Стрыбук заняў 10-е месца, М. Нікіценка — 11-е, А. Аляксандраў — 13-е, Варвара Палякова — 27-е.

У праграме традыцыйнага фестывалю «Чорная пешка» ў Брэсце былі турніры па бліцы і хуткіх шахматах сярод дзяцей (у некалькіх узроставых катэгорыях) і дарослых, спаборніцтвы па рашэнні задач, шашках, паддаўках, «шведках» (калі шахматысты гуляюць у парах, абменьваючыся збітымі фігурамі) і г. д. Моцным атрымаўся турнір па так званым супербліцы: 1) Максім Царук (дзеючы чэмпіён Беларусі па шахматах); 2) Андрэй Гаравец; 3) гросмайстар Кірыл Ступак; сярод жанчын найлепшы вынік паказала Аляксандра Тарасенка. У бліцы прызавую тройку склалі Аляксандр Алішэвіч, Міхаіл Яшчук і Яўген Чупрыненка, у хуткіх шахматах — Яраслаў Навумовіч, Аляксандр Алішэвіч і Максім Царук, у рашэнні задач — Максім Царук, Уладзіслаў Каташук і Аляксандр Варыцкі.

* * *

Прапануем увазе чытачоў яшчэ дзве партыі з нядаўняга турніру ў Рагачове, пра выніі якога мы ўжо распавядалі.

Раман Грыб — Дзмітрый Кананенка. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. Kc3 de 4. K:e4 Cf5 5. Kg3 Cg6 6. h4 h6 7. Kf3 Kd7 8. h5 Ch7 9. Cd3 C:d3 10. Ф:d3 e6 11. Cf4 Фа5+ 12. Cd2 Cb4 13. c3 Ce7 14. c4 Фс7 15. 0-0-0 b5 16. Крb1 bc 17. Ф:c4 Kgf6 18. Ke5 K:e5 19. de Kd5 20. Ca5 Фb7 21. Лd3 Фb5 22. Ф:b5 cb 23. Kf5 Kf4 24. K:g7+ Крf8 25. Лf3 Кр:g7 26. Л:f4 Cd8 27. Cb4 a5 28. Cd6 Лс8 29. a4 ba 30. Лh3 Cg5 31. Лg3 a3 32. C:a3 Лhd8 33. Ла4 Крh7 34. f4 Лd1+ 35. Кра2 Cd8 36. f5 ef 37. Лf4 Лсc1 38. Крb3 Cg5 39. Л:f5 Крg8 40. Ce7 Лd4 41. e6 a4+ 42. Кра2 Лdd1 43. ef+ Крh7 44. f8K+ Крg8 45. Кра3 Лd4 46. b3 Ла1+ 47. Крb2 Лdd1 48. C:g5 Лdb1+ 49. Крc2 ab+ 50. Л:b3 Л:b3 51. Кр:b3 hg 52. Ke6, 1:0.

Платон Клачкоў — Дзмітрый Навіцкі. 1. Kf3 d5 2. d4 Kf6 3. e3 c5 4. b3 Kc6 5. Cb2 Cg4 6. Ce2 e6 7. h3 Ch5 8. Kbd2 Лс8 9. 0-0 Ce7 10. a3 0-0 11. Лс1 cd 12. ed Фb6 13. c3 Cg6 14. b4 Ke4 15. K:e4 de 16. Kd2 Cg5 17. Kc4 Фс7 18. Ла1 Лfd8 19. Фb3 b5 20. Ke3 a6 21. Cc1 Ke7 22. a4 Ф:c3 23. Ф:c3 Л:c3 24. ab ab 25. Cd2 Лсc8 26. C:b5 Л:d4 27. Ca6 Лс7 28. Лfd1 Лсd7 29. Cc3 Л:d1+ 30. K:d1 Kd5 31. Cb7 f5 32. Cc6 Лd8 33. b5 K:c3 34. K:c3 Cf6 35. Лс1 Cd4 36. Лd1 Ch5 37. g4 fg 38. K:e4 gh 39. Лd3 Cg4 40. Лb3 Cb6 41. Лb2 h5 42. Лd2 Лf8 43. Лd7 Cf3 44. Крh2 Cg2 45. Kg5 Л:f2 46. C:g2 Л:g2+, 0:1.

* * *

У партыі з мінулага выпуску белыя выйгралі так: 1. Лgh1! C:d2+ 2. Крd1!! — і чорныя не могуць пазбегнуць мата. Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Слухай сваё

# «Бульба-дэнс» made in Belarus...



**Калі спалучыць у адным відэа вядомых людзей, музыку і прыправіць жывымі ідэямі на тэму «Як любіць сваё і расказваць пра галоўнае проста», то можа атрымацца гучная прэм'ера. Што і адбылося з кампазіцыяй «Бульба-дэнс» у выкананні юнай спявачкі Ангеліны ВОЛКАВАЙ, якую прэзентавалі днямі на тэлеканале АНТ.**

— Пасля выхаду кліпа вельмі хвалююся, бо цікава, як прыме яго аўдыторыя, ці спадабаецца. Але разам з тым адчуваю таксама гонар ад таго, што сам наш Прэзідэнт прыняў удзел у кліпе, паказаўшы прыклад любові да роднай зямлі. Усім і кожнаму, хто ўдзельнічаў у здымках нашай відэаработы, я бязмерна ўдзячная, — кажа выканаўца песні Ангеліна Волкава. — Я сама атрымала вялікае задавальненне ад здымачнага працэсу, хоць і працавалі мы ў спякотнае надвор'е. Было весела і цікава. Там я нават знайшла новых сяброў, з кім мы дагэтуль падтрымліваем сувязь. Таму здымкі кліпа сталі для мяне адной з самых яркіх падзей лета.

Сама песня, словы да якой напісала паэтэса Ганна Сялук (яе аўтарству належаць многія вядомыя кампазіцыі ў рэпертуары нашых беларускіх артыстаў Руслана Аляхно, Вікторыі Алешкі, Алены Ланской і іншых), здаецца на першы погляд даволі простай, але яна запамінальная. А яе запальны рытм настройвае з першых нот на жаданне рухацца, танцаваць у такт. Музыку да кампазіцыі напісаў вядомы беларускі кампазітар Яўген Алейнік. Іх творчы тандэм з Ганнай таксама можна адсачыць па хітах вядомых артыстаў.

— Адпраўным пунктам напісання песні сталі менавіта словы «Бульба-дэнс» і ідэя стварыць кампазіцыю з беларускім каларытам. А што датычыцца тых пасылаў, якія ўжо з'явіліся ў фінальным відэакліпе, то першапачатковай ідэяй было стварэнне новага танцавальнага трэнду. Свайго, беларускага. І харэографы-пастаноўшчыкі Таццяна Трафімава і Дзяніс Кашавы прапанавалі рухі, якія лёгка зможа паўтарыць кожны, нават той, хто не мае нейкіх харэаграфічных здольнасцяў, — дзеліцца Ганна Сялук. — Дарэчы, усе рухі спачатку «тэсціраваліся» на ўдзельніках здымачнай групы і складаныя варыянты тады адразу адпадалі. І менавіта такім чынам прыйшлі да танца, які на працягу ўсяго кліпа суправаджае прыпеў. У працэсе пошуку варыянтаў візуальнага ўвасаблення таксама шмат абмяркоўвалі ідэй, але ў выніку спыніліся на «гарачай бульбе», якая чароўна ўздзейнічае на чалавека, апынуўшыся ў яго руках: ён не можа стрымацца і пачынае танцаваць. Атрымалася такая добрая і вясёлая вандроўка беларускай бульбы ад агарода кіраўніка дзяржавы да стала кожнага беларуса. Вельмі хочацца, каб песня спадабалася слухачам розных пакаленняў, асабліва моладзі.

Прадзюсарам і рэжысёрам кліпа «Бульба-дэнс» выступіла Алена Лобач, якая даўно вядомая аўдыторыі па праектах тэлеканала АНТ (зараз, дарэчы, адзін з такіх — «Зорны шлях» — ідзе ў эфіры па суботах). Як зазначыла яна ў адным інтэрв'ю, стваральнікам кліпа хацелася сказаць пра важныя рэчы, але так, каб гэта было проста і зразумела кожнаму.

Сярод удзельнікаў відэакліпа можна заўважыць самых розных асоб — ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі (у кадр трапілі кадры яго працы падчас збору ўраджаю бульбы) да супрацоўнікаў заводаў, тэлевядучых, спартсменаў, кухараў, харэаграфічных калектываў, а таксама шэрагу таленавітых дзяцей. І хоць у песні яе героі, здавалася б, проста танчаць у такт вясёлай кампазіцыі, але за знешняй прастатой можна прасачыць і больш глыбокія сэнсы, якія аб'ядноўваюць. Яны ў тым, што беларусы заўсёды ўмелі як працаваць на сваёй зямлі, так і радавацца жыццю, рэалізоўваючы сябе ў тым ліку і творча, аб'ядноўваючыся, каб памнажаць, зберагаць і падтрымліваць па-сапраўднаму добрыя і жыццясцвярджальныя ідэі.

17.00 Серыял «Балада аб бомбеbecause» (16+).
18.45 Хакей. BETERA-Экстраліга. «Ліда» — «Маладзечна».
21.00 «Ясна аб міні-футболе».
21.30 Маст. фільм «Экіпаж» (12+).
23.45 Маст. фільм «РЭД-2» (12+).
1.40 Серыял «Ваўчынае сонца» (16+).
3.30 Серыял «Сын бацькі народаў» (16+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

### Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25, 18.15** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**10.00, 11.5, 12.15, 13.10 Драма «Сярэбраны водбліск шчасця» (16+).**
**10.55** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 20.45** «Фактар.BY».
**15.30, 0.05 Серыял «След» (16+).**
**17.05, 18.40, 19.20 Драма «Перакаці-поле» (16+).**
**20.00** Панарама.
**23.10** Клуб рэдактараў (16+).
**01.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.30** «Сакрэты». Дак. драма (16+).
**11.05 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**12.40 Серыял «Доктар Надзея» (12+).**
**14.25, 20.15 Серыял «ІП Пірагова» (16+).**



**15.20** «Сямейныя гісторыі». Дак. драма (16+) [СЦ].
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «На кручку» (16+).
**17.00** «На нажах» (16+).
**18.55** «Дарагая, я забіў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Драма «Лепшыя гады» (16+).**
**23.35** «Тры першыя спатканні» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.10, 16.05, 20.30, 23.25** Навіны культуры.
**8.15, 18.25 «Кураж». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.05, 17.45** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**10.40, 16.15 «Мёртвыя душы». Серыял (12+).**
**12.20** «Сіла веры».
**12.45** «Сваімі словамі».
**13.25** Канцэрт вакальнай групы «Viva».
**14.30, 21.05 Маст. фільм «Бітва за Маскву» (12+) [СЦ].**
**20.15, 23.40** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35** «Кадры жыцця».

### Беларусь 5

**7.00** Хакей для ўсіх.
**7.30** Бокс. Міжнародны турнір памяці В. І. Лівенцава. Мужчыны.
**9.40** Сняданак чэмпіёна.
**10.10** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Масква).
**12.10** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Расіі.
**14.20** Біятлон. Кубак Расіі. Мужчыны.
**15.30** Біятлон. Кубак Расіі. Жанчыны.
**16.40** Планета спорту.
**17.00** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Расіі.
**18.50** Авертайм.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Пекін) — ХК «Сочы».
**21.50** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15 Серыял «Яна не магла інакш» (12+).**
**13.15, 22.45 Серыял «Галубка» (16+).**
**16.20** Інфармацыйны канал (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (12+).
**18.55** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.15** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.20** «Што? Дзе? Калі?» (16+)
**1.05** Час.

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 12.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 11.30, 15.15, 17.20** Дак. праект (16+).
**10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).**
**13.45 «Вонкавы нагляд». Серыял (16+).**
**16.50** «Рашэнне ёсць!»
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** Спецыяльны рэпартаж: «Таямніца душы Мэтра».
**20.55, 23.10 Маст. фільм «Дывергент» (12+).**
**23.50 Маст. фільм «Рыдзік» (16+).**

### МІР

**5.00 Серыял «Развод» [СЦ] (16+).**
**5.15** Мультфільмы (6+).
**7.00, 2.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**7.30, 10.20 Серыял «Меч-2» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15, 17.55** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.05, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.10** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.05** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50** «Слабое звяно» (12+).
**19.40 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).**
**21.10 Маст. фільм «Знахар» [СЦ] (16+).**
**23.40 Маст. фільм «Мэры Попінс, да пабачэння» [СЦ] (0+).**
**2.25 Маст. фільм «Маё каханне» [СЦ] (6+).**
**3.40 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.40** «Кропкі над і» (16+).
**14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**14.40** «60 хвілін».
**17.40** «Лёс чалавека» з Барысам Карчэўнікавым» (16+).
**18.55** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Лепшая сяброўка» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 20.00, 22.40, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.00** Сфера інтарэсаў.
**7.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.15** «НЗ.by».
**8.55** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.10 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).**
**10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).**
**12.20, 14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**16.50** «ДНК» (16+).
**18.00** «Чакай мяне» (12+).
**20.15, 21.45 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).**
**22.45, 0.00 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.50, 19.00, 21.05, 0.55** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Захавальнік леў» (0+).
**7.30 Дзіцячы серыял «Хачу ў кіно» (6+).**
**7.40 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.25** Дак. серыял «Зваротны адлік».
**9.15 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).**
**10.00 «20 000 лье пад вадой» (12+).**
**12.10 Драма «Барацьба з ільдом» (12+).**
**13.50 Драма «Сланечнікі» (16+).**
**15.55** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**16.00** Мультпарад. «Шахеразада» (6+).
**16.25 Драма «Каралева прыгажосці Іерусаліма» (16+).**
**18.00 Серыял «Змова сясцёр» (16+).**
**19.05 Дэтэктыў «Кандыс Рэнуар» (18+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Баявік «Кодэкс злодзея» (16+).**
**22.55 Фантастыка «Чалавек-невідзімка» (18+).**



### ВТБ

**6.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00** «Раніца з гумрам» (16+).
**10.45** «Лаві момант» (16+).
**11.45, 23.10** «КВЗ. Панашаму» (16+).
**13.00, 2.35** «Проста кухня» (16+).
**13.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**14.45, 0.00** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**15.40** Серыял «Варонін» (12+).
**17.25** Серыял «Кухня» (16+).
**19.10** Серыял «Пастухай у мае дзверы» (16+).
**20.00** Серыял «Госці з мінулага» (16+).
**21.00** Драма «Дом каля возера» (12+).
**22.40** «Велабайкі» (16+).
**0.55** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.25** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.15** «6 кадраў» (16+).
**5.10** Серыял «Ранеткі» (12+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35, 16.35** «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Маст. фільм [СЦ].
**8.45, 13.50, 2.15** «Першыя ў свеце».
**9.05, 23.05** «Скарбы Маскоўскага Крамля» [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.20** XX стагоддзе.
**12.20** Дарогі старых майстроў.
**12.30, 22.15** «Ціхі Дон». Серыял [СЦ].
**13.20, 2.30** Правінцыяльныя музеі Расіі.
**14.05** Лінія жыцця [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**15.50** «Белая студыя».
**17.40** Кампазітары.
**18.25** Колер часу.
**18.35, 1.25** «Дзеці Сонца». Дак. фільм [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** «Абсалютны слых».
**21.30** Улада факта.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**6.55, 8.45, 9.40, 11.25, 12.40, 14.40, 15.40, 17.30, 21.40, 23.30, 2.50, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Воблака — рай» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.20** Маст. фільм «Зачараваныя» (18+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.00** Маст. фільм «Якая зялёная была мая даліна» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Найлепшыя гады нашага жыцця» (16+).

### EuroSport 1

**3.30, 13.35** Снукер: UK Championship (6+).
**5.00, 5.45, 11.00, 11.30, 17.00, 17.45** Горныя лыжы: кубак свету, Леві. Жанчыны (6+).
**6.30, 18.35** Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў, Берлін (6+).
**8.30** Паўэрліфтынг. Чэмпіянат свету (6+).
**10.35** Парусны спорт. «Дух парусната спорту» (6+).
**12.15, 12.45** Горныя лыжы: кубак свету, Зёльдэн. Мужчыны (6+).
**15.00** Electric Touring Car Racing: кубак свету (6+).
**16.00** Electric Touring Car Racing (6+).
**20.30** Усе віды спорту (6+).
**21.00** Кёрлінг: чэмпіянат Еўропы, Эстэрсунд. Жанчыны: Германія — Данія (6 +).
**0.00, 0.05, 0.35, 1.05** Алімпійскія гульні (6+).
**1.35** Гольф. Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
**2.05** Фрыстайл: кубак свету, Штубай. Мужчыны і жанчыны (6+).

### Кінакамедыя

**1.35, 23.15** Чарапашкі-ніндзя (12+).
**3.10** Выкідала (18+).
**4.45** Кахаю цябе, чувак (16+).
**6.40** Так сабе канікулы (6+).
**8.20** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**10.15** Зламі мяне, калі зможаш (12+).
**12.50** Апошні водпуск (12+).



**14.55** Форэст Гамп (12+).
**17.35** Пікселі (12+).
**19.30** Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).
**21.10** За бортам (12+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.35, 22.35** «Анатомія забойства» (16+).
**11.10** «Перыскоп» (16+).
**11.30** «Містычныя гісторыі» (16+).
**13.10, 19.35, 2.55** «Сляпая» (16+).
**14.10, 20.35** «Варажбітка» (16+).
**15.10, 17.40, 3.45** «Паралельны свет» (16+).
**16.05** «Старац» (16+).
**16.35** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**18.40** «Трынаццаць» (16+).
**21.35** «Непрыгожая сяброўка» (12+).
**0.15** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.05** «Блэйд-2» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.25, 18.10** Элементарна (16+).
**6.20, 2.05** Тайнае акно (12+).
**8.00, 3.35** Словы (12+).
**9.40** Мемуары гейшы (16+).
**12.15** Апошні самурай (16+).
**15.00** Сем гадоў у Тыбеце (16+).



**19.00** Век Адалін (16+).
**21.00** Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
**23.55** Легенды восені (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Фіксікі (6+).
**6.35** Пін-код (6+).
**7.40** Тры каты (6+).
**8.50** Мой хлопец — анёл (16+).
**10.25** Каханне з абмежаваннямі (16+).
**12.15, 0.10** Светлячок (12+).
**13.55** Каханне і монстры (16+).
**15.30** Вяселле па абмене (16+).
**17.05, 18.00** Жоўтае вока тыгра (16+).
**19.00, 3.40** Булкі (16+).
**20.50** 14+ (16+).
**22.40** Каралева (12+).
**1.40** Неадэкватныя людзі-2 (16+).

### National Geographic

**6.00, 18.35, 19.00** Фабрыка ежы (16+).
**6.20, 6.45** Навуковыя глупствы (16+).
**7.10, 8.00** Неверагодны доктар Пол (16+).
**8.50, 9.45** Суперзбудаванні (16+).
**10.35, 11.25** Аўта-SOS (16+).
**12.15, 13.00** Востраў бунтароў (16+).
**13.45, 14.35, 19.25, 20.10, 0.10, 1.00** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.20, 16.10, 1.45, 2.30** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**16.55, 17.20** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**17.45** Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**21.00** Самыя цікавыя моманты гісторыі (16+).
**21.50** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
**22.35, 23.25** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**3.20** Даследчык: найглыбейшая пячора (16+).
**4.10** Суперзбудаванні: цуды інжынерыі (16+).
**5.10** Гульні розуму (16+).

### ЯСНАе

**5.20** Серыял «Контргульня» (12+).
**6.55** Серыял «Чорныя кошкі» (12+).
**8.30** Серыял «Чорны сабака» (12+).
**10.05** Серыял «Афіцэры» (12+).
**11.50** Серыял «Крапавы берэт» (12+).
**13.25** Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (16+).
**15.15** Маст. фільм «Дняпроўскі рубеж» (16+).
**17.35** Серыял «Снег і попел» (16+).
**19.10** Серыял «Без права на выбар» (16+).
**21.00** Дак. цыкл «Сувязісты».
**21.25** Маст. фільм «Апошні паляўнічы на ведзьмаў» (16+).
**23.15** Маст. фільм «Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы» (16+).
**0.40** Серыял «Ваўчынае сонца» (16+).
**2.30** Маст. фільм «Яшчэ пра вайну» (12+).
**3.25** Серыял «Сын бацькі народаў» (16+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.20** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**10.00, 11.45, 12.15, 13.05 Драма «Прыватнае жыццё» (16+).**
**10.50, 0.55** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 20.50** «Фактар.BY».
**15.30, 22.25 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка (прамы эфір).
**18.30, 19.20 Драма «Перакаці-поле» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.40** «Санкцыі для народа». Тэлефільм АТН (12+).
**22.00** Адзін дзень (12+).
**0.00** Сфера інтарэсаў.
**0.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+).
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 18.40 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.30, 19.10** «Сакрэты». Дак. драма (16+).
**11.05, 17.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**12.40, 20.40, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (12+).**
**14.25, 19.45 Серыял «ІП Пірагова» (16+).**
**15.20** «Сямейныя гісторыі». Дак. драма (16+) [СЦ].
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.35 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).**
**23.30** «Тры першыя спатканні» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.15** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.05, 16.15, 20.30, 23.25** Навіны культуры.
**8.15, 18.25 «Кураж». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.05, 17.45** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**10.45, 16.25 «Мёртвыя душы». Серыял (12+).**
**12.45** «Сваімі словамі».
**13.25** «Жывая спадчына».
**13.55** «Напярэдадні пераможнай вясны». Канцэрт Тамары Гвердцытэлі «Балада пра вайну».
**14.50, 21.05 Маст. фільм «Бітва за Маскву» (12+) [СЦ].**
**20.15, 23.35** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.30** «Кадры жыцця».

## Беларусь 5

**7.00** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «Тайфун» (Прыморскі край).
**8.55, 22.15** Біятлон. Кубак Расіі. Мужчыны.
**10.00** Сняданак чэмпіёна.
**10.35** Між іншым.
**10.55, 23.20** Біятлон. Кубак Расіі. Жанчыны.
**12.00** Бокс. Міжнародны турнір памяці В. І. Лівенцава. Жанчыны.
**14.30** Слэм-данк.
**15.00** Планета спорту.
**15.20** Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Енісей» (Краснаярск) — БК «Мінск».
**17.10** Бокс. Міжнародны турнір памяці В. І. Лівенцава. Мужчыны.
**18.00** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Расіі.
**19.05** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Масква).
**21.35** Спорт-цэнтр.
**21.45** Хакей для ўсіх.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15 Серыял «Яна не магла інакш» (12+).**
**13.15, 23.10 Серыял «Галубка» (16+).**
**16.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**22.00 Серыял «Ахвяра каханння» (16+).**
**1.30** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 11.30** Дак. праект (16+).
**10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).**
**11.40 «Паляўнічыя на брыльянты». Серыял (12+).**
**13.45** Таямніцы Беларусі.
**14.40, 16.50, 1.05 «Вонкавы нагляд». Серыял (16+).**
**20.15, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**20.40 «САХР». Серыял (16+).**
**23.10 «Ілюзія падману-2» (12+).**

## МІР

**5.00, 3.00 Серыял «Развод» [СЦ] (16+).**
**6.40** Мультфільмы (6+).
**7.10, 1.10** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**7.40, 10.10, 22.40 Серыял «Меч-2» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 17.55** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.05, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.10** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.05** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50, 19.25, 20.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.50** «Слабае звяно» (12+).
**21.45** «Назад у будучыню» (16+).
**1.30 Маст. фільм «Таямнічы востраў» (0+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.45** «Кропкі над і» (16+).
**14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**14.40** «60 хвілін».
**17.40** «Лёс чалавека» з Барысам Карчэўнікавым» (16+).
**18.55** «Малахаў» (16+).
**21.30 Серыял «Баранцава мора» (16+).**



**22.30, 23.15 Серыял «Асабістая справа» (16+).**
**23.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.15, 8.20, 13.25, 16.40, 20.00, 22.30, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.00** Сфера інтарэсаў.
**7.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.15** «НЗ.by».
**8.55** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.10 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).**
**10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).**
**12.20, 14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.30, 16.50** Надзвычайнае здарэнне.
**17.10** «За гранню» (16+).
**18.05** «ДНК» (16+).
**20.15, 21.35 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).**
**22.35, 23.50 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.10, 18.55, 21.10, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Захавальнік лею» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.20** Дак. экран «Навуковыя сенсацыі».
**8.50 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).**
**9.30** «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан» (12+).
**12.05 Камедыя «Бландзінка ў законе» (12+).**
**13.45 Драма «Рэпетытар» (16+).**
**15.15** Мультпарад. «Шахеразада» (6+).
**15.40 Драма «Каралева прыгажосці Іерусаліма» (16+).**
**17.15 Серыял «Змова сясцёр» (16+).**
**19.00 Дэтэктыў «Кандыс Рэнуар» (18+).**
**20.45** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Салям алейкум, Беларусь!»
**21.15 Драма «Выжыць» (18+).**
**23.30 Трылер «Гравітацыя» (16+).**







## ВТБ

**6.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45** «Лаві момант» (16+).
**11.45, 23.05** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**13.00, 2.35** «Проста кухня» (16+).
**13.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**14.45, 0.00** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**15.40** Серыял «Вароніны» (12+).
**17.25** Серыял «Кухня» (16+).
**19.10** Серыял «Пастухай у мае дзверы» (16+).
**20.00** Серыял «Госці з мінулага» (16+).
**21.00** Фантастыка «Бойфрэнд з будучыні» (12+).
**0.55** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.25** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.15** «6 кадраў» (16+).
**5.10** Серыял «Ранеткі» (12+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35** «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Маст. фільм [СЦ].
**8.45** «Забытае рамяство».
**9.05, 23.05** «Скарбы Маскоўскага Крамля» [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.20** ХХ стагоддзе.
**12.30, 22.15** «Ціхі Дон». Серыял [СЦ].
**13.20, 2.30** Правінцыяльныя музеі Расіі.
**13.50** «Абсалютны слых».
**14.30** «Яго Галгофа. Мікалай Вавілаў». Дак. фільм.
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Маё каханне — Расія! [СЦ]
**15.50** «2 Вернік 2».
**16.40** «Сапраўднае-мінулае. Пошукі і знаходкі». Дак. серыял.
**17.10** Кампазітары.
**18.35, 1.35** «Сакрэты Калізея». Дак. фільм (ЗША) [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** «Вайна і мір». Апаратарскі ракурс». Дак. фільм [СЦ].
**21.30** «Энігма. Дзмітрый Маслееў».

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.40, 8.40, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 18.45, 20.45, 21.40, 23.30, 0.55, 2.45, 3.40, 5.25** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Зачараваныя» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.00** Маст. фільм «Якая зялёная была мая даліна» (16+).
**18.00** «Ялова субмарына» (16+).
**19.20** Маст. фільм «Якая цудоўная гульня» (18+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.30** Маст. фільм «Вобласка — рай» (18+).

## EuroSport 1

**3.30, 4.15, 6.30, 7.15, 7.45, 13.00, 13.30, 21.00, 21.30** Горныя лыжы: кубак свету, Леві. Жанчыны (6+).
**5.00, 8.30** Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў, Берлін (6+).
**10.30** Гольф. Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
**11.00, 17.00** Скачкі на лыжах з трампліна: кубак свету, Вісла. Мужчыны (6+).
**12.00** Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Мужчыны (6+).
**14.00, 18.00** Кёрлінг: чэмпіянат Еўропы, Эстэрсунд. Жанчыны (6+).
**22.00** Кёрлінг: чэмпіянат Еўропы, Эстэрсунд. Мужчыны (6+).
**1.05** Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (0+).
**2.00** Снукер: UK Championship (6+).

## Кінакамедыя

**1.00** Клік: з пультам па жыцці (12+).
**2.55** Двайныя непрыемнасці (16+).
**4.35** Чарапашкі-ніндзя-2: таямніца ізумруднага зелля (6+).
**6.10** Мая супербылая (16+).
**7.55** Джуманджы (6+).
**9.50** Тупы і яшчэ тупейшы-2 (16+).
**11.50** З 13 у 30 (12+).



**13.40** Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
**15.50** Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).
**17.30** Белыя цыпачкі (12+).
**19.30** Шэсць дзён, сем начэй (16+).
**21.20** Джыгалоу (16+).
**23.05** Пікселі (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.25, 22.35** «Анатомія забойства» (16+).
**11.00** «Улегцы» (16+).
**11.30** «Містычныя гісторыі» (16+).
**13.10, 19.35, 3.00** «Сляпая» (16+).
**14.10, 20.35** «Варажбіта» (16+).
**15.10, 17.40, 3.50** «Паралельны свет» (16+).
**16.05** «Старац» (16+).
**16.35** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**18.40** «Трынаццаць» (16+).
**21.35** «Непрыгожая сяброўка» (12+).
**0.15** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.05** «Дванаццаць сяброў Оўшэна» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.10, 5.45, 17.25, 18.10** Элементарна (16+).
**6.35** Заходны код (16+).
**8.10** Час (16+).
**10.05** Век Адалін (16+).
**12.05** Легенды восені (16+).



**14.25** Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
**19.00** Гісторыя рыцара (12+).
**21.20** Трыстан і Ізольда (12+).
**23.35** Рамэа і Джульета (12+).
**1.30** Асаблівая думка (16+).
**3.40** Заходны код (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Фіксікі (6+).
**6.30** Пін-код (6+).
**7.35** Тры каты (6+).
**8.20** Неадэкватныя людзі-2 (16+).
**10.25** Каралева (12+).
**12.00** 14+ (16+).
**13.50, 3.30** Лёгкі на ўспамін (12+).
**15.15** Булкі (16+).
**17.05, 18.00** Жоўтае вока тыгра (16+).
**19.00** Хачу замуж (12+).
**20.55** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**22.50** Пяць нявест (16+).
**0.35** Білет на Vegas (16+).
**2.05** Змешаныя пачуцці (16+).

## National Geographic

**6.00, 18.35, 19.00** Фабрыка ежы (16+).
**6.20, 6.50** Навуковыя глупствы (16+).
**7.15, 8.00** Неверагодны доктар Пол (16+).
**8.50, 9.40** Суперзбудаванні (16+).
**10.35, 11.20** Аўта-SOS (16+).
**12.10, 12.55** Востраў бунтароў (16+).
**13.45, 14.30, 19.25, 20.10, 0.15, 1.00** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.20, 16.05, 1.45, 2.35** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**16.55** Даследчык: найглыбейшая пячора (16+).
**17.45** Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**21.00, 4.00** Сакрэты Другой сусветнай вайны (16+).
**21.45** Нераскрытыя таямніцы Другой сусветнай вайны (16+).
**22.35, 23.25** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**3.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**4.55** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**5.20** Гульні розуму (16+).

## ЯСНАе

**5.10** Серыял «Контргульня» (12+).
**6.40** Серыял «Чорныя кошкі» (12+).
**8.15** «Ясна аб футболе».
**8.50** Серыял «Чорны сабака» (12+).
**10.25** Серыял «Афіцэры-2» (12+).
**12.15** Серыял «Апошні браняпоезд» (16+).
**14.05** Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (16+).
**15.50** Серыял «Снайпер-2. Тунгус» (16+).
**17.25** Серыял «Снег і попел» (16+).
**19.05** Серыял «Без права на выбар» (16+).
**21.00** «У адкрытым доступе».
**21.30** Маст. фільм «Гарачыя навіны» (16+).
**23.20** Маст. фільм «Прывідны гоншчык-2» (12+).
**0.55** Серыял «Ваўчынае сонца» (16+).
**2.45** Дак. серыял «Спадчына» (6+).
**3.20** Серыял «Сын бацькі народаў» (16+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ДОБРЫ ДОКТАР, альбо Галоўнае — правільны дыягназ

...Тэлефон на ФАПе зазваніў зусім недарэчы — у пятніцу, пад самы канец рабочага дня, і нічога добрага абяцаць не мог. Але ж дакторка (назавём яе Святланай) зняла-ткі слухаўку. З таго канца проваду пачула слабы, але ж добра знаёмы голас: Іванаўна, кабета з суседняй вёскі, слёзна прасіла прыйсці, бо ёй, маўляў, вельмі і вельмі дрэнна.

Дакторка ні хвіліны не сумнявалася ў тым, што гэта не так, што выклік (да бабкі не хадзі!) чарговы раз беспадстаўны, але ж... Абавязак...

На вуліцы ішоў дождж (прычым не першы дзень), дарога — усе два кіламетры да вёскі, дзе чакала Іванаўна, — хутчэй за ўсё, патанала ў гразі. А таму Святлана звычна ўсунула ногі ў гумовікі, узяла парасон ды свой чамаданчык з неабходным медыцынскім наборам і рушыла на выклік.

...«Хворая» ляжала ў зале на канапе і ціха стагнала. Галава яе была абкручана хусткай, побач на табурэтцы ляжала горка нейкіх таблетак. Муж гаротніцы сядзеў непадалёк, пазіраў на абедзвюх жанчын ды цяжка ўздыхаў, чакаючы вердыкту.

А пакуль — дакторка дастала танометр і тэрмометр, памерала ціск і тэмпературу, палічыла пульс, паслухала сэрца і лёгкія, памацала жывот. Усе паказчыкі ў «хворай» былі ў норме, але ж сказаць пра гэта (нават самымі далікатнымі словамі) значыла ўбачыць у вачах Іванаўны горкія слёзы, пачуць ад яе, што цяперашнія дактары дрэнна разбіраюцца ў хваробах і лячыць не ўмеюць, што вось некалі...

Гэта Іванаўна ўжо казала і ў вочы, і за вочы.

Не жадаючы слухаць яшчэ раз, Святлана моўчкі дастала стэрылізатар і дзве ладныя ампулы дыстыляванай вады, якой разбаўлялі антыбіётыкі для ін'екцый, папрасіла «хворую» перавярнуцца — легчы на жывот (і заўважыць пры гэтым яе проста пераможны позірк на мужа!), але асцярожна зрабіць укол.

Падчас яго твар жанчыны аж пераксіўся ад болю! Але ж ніякай шкоды ён прынесці не мог. Хіба карысць?

І сапраўды: цэлы месяц прайшоў, за ім другі і нават трэці — ад Іванаўны званкоў не было: не выклікала яна болей дакторку.

А вось муж яе па дарозе з горада аднойчы зайшоў, каб пацiснуць руку, падзякаваць за лячэнне.

— Няўжо дапамагло? — спытала дакторка ў шчаслівага мужа.

— Яшчэ і як! — усклікнуў той. — Не паверыце: маёй Іванаўне больш нічога не баліць! Працуе гаспадынька, розныя прысмакі гатуе, дзяцей у госці прымае, нават унукаў на канікулы згадзілася ўзяць!..

А то ж (мужчына ў гэтым па сакрэце прызнаўся) ленавалася раней, не хацела перад выхаднымі ў хаце прыбіраць, есці на ўсіх гатаваць ды ў садзе-гародзе нешта разам рабіць. Значыць трэ было прычыну знайсці: залегчы, прытварыцца хворай. А вы, госцікі, самі тут гаспадарце, самі пра сябе клапацiцеся... Ды яшчэ і яе пашкадуйце!

— Цяпер вось гэтага зусім няма! — запэўніў Святлану муж. — Значыць, ты, дакторка, малайчына: правільны дыягназ паставіла! І укол падабрала добры: акурат такі, як маёй і патрэбен быў!

...Святлана ў адказ толькі ўсміхнулася!

**В. Бабко-Аляшкеч,**
*Салігорскі раён.*

## БЫЛЬ ПРА ПАРТРЭТ ПРАВАДЫРА

І смех і грэх — кажуць пра тое, што смешна і ў той жа час сумна.

А яно і сапраўды: трагікамічнае часам жыццё — і ёсць, і...

— Пасля вайны было такое, —
Міхась аднойчы распачаў, —
Я —
дзіцятка тады малое:
Пад стол
без штонікаў гуляў.
Бацькі мае —
ужо ў калгасе —
Трымалі свінства і курэй.
Які дастатак па тым часе?!
Пад'еў крыху —
і весялей!
А сала, курак,
яек колькі
У краму бацечка насіў:
Здаваў, як людзі,
нарыхтоўкі.
Заместа гэтага прасіў
Касу, гаршчок, малым — кашуляў...
На куплю ж
грошай не было,
Бо зарабляла з макам дулю
Пасляваенная сяло.
...Дык вось.
Субота. Яйкі ў кошык,
За тыдзень татка наш сабраў,
З паўсотні мо...
І з гэтай ношай
У краму зноў пашыбаваў.
Агледзеў крамнік нарыхтоўку,
Пералічыў і ацаніў.
Хусцінку —
маме на абноўку —
Узамен мой тата папрасіў.
Стаў аглядаць далей вітрыну,
Партрэт, як зданне, там стаіць:
Вусаты, з позіркам арліным
Генералісімус глядзіць.
Яго б дамоў...
Ды асцярожна
У крамніка дай бог спытаць:
— Скажы, браточак, а ці можна
За яйкі Сталіна ўзяць?
Партрэт
Імгненна ў газету
«Браточак» тату загарнуў:
Баяўся,
каб крамолы нейкай
Ніхто не ўбачыў, не пачуў,
Бо за падобныя размовы
Сустрэла б матухна-Сібір...
Ды ў хаце
з выглядам суровым
Вісеў нядоўга правадыр:
Была хрушчоўская адліга,
А следам —
брэжнеўскі застой...
Чыталі вы пра гэта ў кнігах.
А я —
партрэт запомніў той!
...Міхась закончыў успаміны.
Хто рагатаў, а хто маўчаў.
Пазней хіба чынілі кпіны:
«Як бацька Сталіна прыдбаў?»

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*

## ДАРАГІ ПАДАРУНАК

Сёлета мы з сястрой і нашымі мужчынамі (яе мужам і сынам ды маімі ўнукамі) зрабілі даволі добрую справу: нарыхтавалі і здалі ажно тры тоны яблыкаў! Вядома ж, не дарма: зарабілі на гэтым каля 600 рублёў і нават вырашылі, што ўсе гэтыя грошы аддадзім — хай на дробны, але ж рамонт хаты, якую некалі, на пачатку 60-х, дабудоўваў тата... Што цікава — якраз за яблыкі...

У нашых мясцінах, мусіць, заўжды казалі: у каго сад, у тога і грошы. Першае ў нас дакладна было. Наколькі ведаю, адзін з дзядоў, Іван, яшчэ да «абразання лішняй зямлі» (быў такі перыяд у нашай гісторыі), аддаў нам частку свайго надзелу і тры рады яблынь. Да іх, дзядулевых, наш тата насадзіў сваіх маладзенькіх і распачаў будаўніцтва дома.

Трэба сказаць, што ў тыя часы гэта рабілі многія — перацягвалі старыя хаты з хутароў, нават ставілі новыя. Прычым — немаведама за што, бо грошай у калгасе людзям не плацілі...

Але ж тады яблыкі былі ў цане, і нашы вяскоўцы ўжо ўмелі іх прадаваць. Адны — акурат як цяпер — здавалі перакупшчыкам, другія, можна сказаць, самі — вазілі свой тавар у розныя гарады. (Што, дарэчы, дрэнна паддаецца разуменню: як можна было без інтэрнэту і тэлефанаў недзе ў чорта на рагах знайсці і замовіць грузавую машыну? Потым тут, у вёсцы, загрузіць яе найболей антонаўкай — акуратна знятай і складзенай у спецыяльныя драўляныя скрынкі, адправіць іх у тую ж Маскву ці Піцер, следам на цягніку паехаць самім і неяк жа «адшукаць» у гэтых сталіцах свой тавар — прадаць яго, прычым з выгадай!

...У тую восень да такіх вось прадаўцоў далучыўся і наш тата.

Папярэдне ў яго цёплай суконнай бравэрцы мама прышыла адмысловую ўнутраную кішэнь (вяскоўцы тады часта абіралі на кірмашах ды ў цягніках) і благаславіла ў дарогу.

Тата паехаў, а мы ўтраіх сталі даглядаць гаспадарку і чакаць, калі ж ён вернецца?!

...І вось тыдні праз два, увечары (як цяпер гэта чую) — стук у акно! Мы з сястрычкай у крык:

— Татачка! Тата!

І бегма да дзвярэй!

Думаем, зараз жа, па чарзе ён падхопіць нас на рукі, абдыме, прытуліць...

Аж не!

Тата сапраўды стаяў на парозе, але кінуцца яму на шыю нам не выпадала, бо ў руках ён трымаў нешта вялікае, рагатае... Я нават не адразу мела што, пакуль тата не апусціў, не паставіў рэч на падлогу.

Вось тады мне ўсё стала ясна: гэта быў... ровар!

— На яго, на цацку, усе грошы спусціў? — з недаверам спытала мама.

— Не, не ўсе, — усміхнуўся тата і з той самай унутранай кішэні дастаў аб'ёмны кашалёк.

Але ж нас з сястрычкай ён зусім не цікавіў, а вось ровар — жалезны, з трыма коламі, з тоўстымі надзьмутымі шынамі, з вялікім багажнікам, на які можна было пасадзіць некага з дзяцей, з месцам для нумарнога знака... Ён нават не блакітным быў, як дзіцячыя мары! «Ён, — сказаў наш татка, — акурат такі, як марскія хвалі».

...На той час у нашай вёсцы, у акрузе (а мо і ва ўсім раёне!), падобнага цуду не меў ніхто! Хіба мы з сястрычкай «рассякалі» на ім па новай і пустой яшчэ хаце.

Потым, калі прыйшла вясна, на нашым роварах гойсалі ці не ўсе тутэйшыя дзеці.

...Што цікава, аднойчы, успамінаючы ўжо нябожчыка тату, мама расказала, як ён тым разам дабіраўся з Масквы — цягніком, у агульным вагоне. Людзей, маўляў, у яго набілася шмат: рэчы паставіць не было дзе. Таму наш ровар тата ці нехта з мужчын ледзь не ўсю дарогу да Мінска (!) трымалі на руках, над галовамі іншых пасажыраў.

...І яшчэ. Праз гады з нашым роварам нічога такога не зрабілася. Ва ўсякім разе ў пачатку 90-х на ім (пасля лёгкага рамонту) яшчэ каталіся дзеці маёй сястры.

У яе сям'і гэта рэч захоўваецца і цяпер — у якасці рэліквіі.

...Вось такі падарунак зрабіў нам тата. Мы з сястрой помнім яго ўсё сваё жыццё! Дзеці і ўнукі, спадзяёмся, не забудуць таксама.

**Таццяна Новік,**
*г. Клецк.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

---

Неасабісты суб'ектыў



# АД «ТРЫВАЛАЯ» І «ЦЯРПЛІВАЯ»...

## Роздум да форуму сельскіх жанчын

СЁННЯ ў Мінску ўпершыню адбудзецца цікавае і важнае мерапрыемства — Форум сельскіх жанчын. Калі пра гэта было абвешчана, давялося ад некалькіх людзей пачуць скептычнае: маўляў, а калі тады будзе форум гарадскіх жанчын? І ўвогуле, навошта так дзяліць па прынцыпе месцазнаходжання? І вось тут я падумала, што трэба абавязкова пра гэта напісаць. Бо, на жаль, многія, асабліва маладзейшыя, зусім невялікае ўяўленне маюць (а то й не маюць зусім), што вясковая жанчына — гэта не паняцце месца пражывання. Гэта найперш стыль жыцця — абраны ці наканаваны. І само жыццё — зусім іншае, чым у горадзе. Па рытме, па насычанасці, па сэнсах і каштоўнасцях, у рэшце рэшт.

Гэта добра, што іх — найперш працаўніц сельскай гаспадаркі — збяруць перад прафесійным святам у сталіцы, у Вялікім тэатры. Гонар, пашана, усведамленне значнасці сваёй працы, магчымасць абнавіць прыгожую сукенку... Я ўпэўнена: за тых, хто трапіць на гэта свята, абавязкова парадуюцца астатнія. Асабліва вясковыя пенсіянеркі, якія прычакалі прызнання і падзякі хай сабе і праз час.

Я шмат іх ведаю асабіста — усе жанчыны з нашай вёскі, з суседніх. У іх спрацаваныя вялікія рукі, якія ніколі не зналі манікюру. Многія з іх і сёння прачынаюцца ў пяць гадзін раніцы, хоць і патрэбы асаблівай няма — з гаспадаркі толькі куры ды каты. Але вымушаная прывычка — уставаць на ранішнюю дойку, ці да цялят, ці да парасят, у іх засталася ўжо на ўсё жыццё. Яны могуць нямала расказаць пра свае калгасныя будні — і пра тое, як уручную раздойвалі па сорак кароў, і пра тое, як цягалі на плячах важкія мяшкі з камбікормам, як цяжка працавалі «на брыгадзе» ці на таку — гэта толькі ў кіно 50-х гераіні віламі ды лапатамі махаюць бы веерам...

Яшчэ гадоў дзесяць таму былі жывыя бабулі, якія працавалі ў калгасе за палачкі-працадні і сыходзілі пасля з гэтай працы на мінімальную савецкую пенсію — дваццаць восем рублёў. Іх расповеды для гарадской, дый нават і вясковай моладзі выглядалі як фантастычныя апавяданні. Напрыклад, бабуля расказвала, як ездзіла з залвіцай — дзве маладыя маленькія і худзенькія жанчыны — у лес на нарыхтоўку дроў. Спілаваныя елкі трэба было абсекчы ад сукоў і галін, пагрузіць на сані, прывезці. І так некалькі рэйсаў, у кароткі зімовы дзень, у дваццаціградусны мароз. Калі везлі апошнія сані, кіламетры за тры ад вёскі зламалася аглобля. Вельмі хутка стала цямнець, побач завылі ваўкі, конь пачаў станавіцца на дыбы... Нейкім цудам дабраліся да вёскі, дацягнулі сані, давезлі тыя няшчасныя дровы. Аб тым, каб кінуць усё і ратавацца самім — нават у думках не было. Чаму на такую работу мужчын не пасылалі? Маё пытанне, здавалася, бабка нават не зразумела. Пасля проста адказала: у мужчын іншая праца была, у нас — гэта, усім хапала.

МАЯ матуля, якая пасля школы выскачыла замуж, пайшла працаваць у калгас у няпоўныя васямнаццаць. Ёй, маладому дзеўчаняці, тут жа далі «пасільную» работу — цягаць мяшкі са збожжам на другі паверх млына... За што, уласна, яна дзякавала лёсу і чалавеку, які яе на гэту работу паставіў: маўляў, менавіта тады, з тым мяшком за плячыма, вырашыла, што трэба ісці вучыцца далей. Але з таго часу і ўсё жыццё яна насіла толькі шчыльныя панчохі — ад тых практыкаванняў на нагах павыпіралі вены, якія да таго ж пад старасць вельмі моцна балелі... У цёткі Марыі, якая ўсё жыццё працавала даяркай на ферме, ногі таксама балелі, але па іншай прычыне — нават у моцны мароз яна хадзіла ў гумовых ботах, бо на іхнім кароўніку ў аддаленай калгаснай брыгадзе скаціну падсцілалі нячаста — не было ні саломы, ні пілавіння... І пры гэтым яна з такой любоўю і пяшчотай ужо на глыбокай пенсіі згадвала пра сваіх каровак — некаторых нават памятала па характары і па імёнах...

А пагаварыце шчыра з нашай легендарнай трактарысткай Таццянай Уладзіміраўнай Захожай, якая працуе ў гэтай нежаночай прафесіі ўжо амаль паўстагоддзя. Яна вельмі любіць сваю работу, але ж як цяжка было, асабліва на пачатку, у 70-х. Пра яе, зямлячку, я пісала калісьці нарыс і, памятаю, вельмі радавалася, што акурат тады падгледзела ў кагосьці з пісьменнікаў новае для сябе слова — «трывушчая» — штосьці зборнае ад «трывалая» і «цярплівая». Гэта якраз пра яе. І пра іншых жанчын, якія па волі лёсу ці паводле ўласнага выбару засталіся працаваць у вёсцы.

ЦЯПЕР, канешне, многае змянілася. І тыя, хто прыедзе на форум, працуюць у зусім іншых умовах — на мадэрнізаваных фермах, у сучасных цяпліцах, на аўтаматызаваных збожжасховішчах... Але фізічную працу вельмі цяжка замяніць сучаснымі машынамі цалкам. Гэтаксама як немагчыма змяніць час ранішняй дойкі ці кармлення скаціны і патлумачыць тое карове. Як немагчыма жыць на зямлі і не трымаць агарод ці якое свінчо... Таму яны, хоць і з манікюрам, і з сучаснымі прычоскамі, і ў прыгожых сукенках — усё роўна асаблівая катэгорыя. Трывушчыя. Самая надзейная аснова і для сям'і, і для краіны.

ДОБРА, што для іх прыдумалі ўрэшце гэта свята. Для іх усіх — зусім няважна, ці будуць яны на форуме. Пашана і прызнанне — вось што важна. Можа, гэта будзе першы крок і да Дня сельскай працаўніцы. Яны таго вартыя.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «РАЙБЫТУСЛУГИ» г. Калинковичи – в лице ликвидатора, извещает о проведении 20 декабря 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 333/D-46321**, площадью **887,9 кв. м**, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – **коммунально-бытовое помещение, находящееся на 1–3-м этаже. Адрес:** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3-1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100002002684** общей площадью **0,1118 га** – для обслуживания производственного здания со встроенным помещением финансового назначения (для размещения объектов бытового обслуживания населения). **Право постоянного пользования (доля в праве 23/25).** Местоположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3. **<u>В состав лота входят:</u>** оборудование и инвентарь в количестве 405 ед. **Обременение:** доп. соглашение к договору аренды № 7/06.2018 от 14.09.2020 г. по 13.09.2023 г.; договор аренды № 1/062020 от 01.06.2020 г. по 31.05.2023 г.; договор аренды № 03/01.22 от 03.01.2022 г. по 02.01.2023 г.; доп. соглашение к договору аренды № 10/05.19 от 09.05.2020 г. по 08.05.2025 г.; доп. соглашение к договору аренды № 09/01.13 от 03.01.2021 г. по 02.01.2023 г.; договор аренды № 01/01 2020 от 20.01.2020 г. по 19.01.2023 г.; доп. соглашение к договору аренды № 06/07.2020 от 30.07.2021 г. по 29.07.2023 г.; договор аренды № 11 от 11.01.2021 г. по 31.12.2023 г.; договор аренды № 30/11 2021 от 30.11.2021 г. по 31.07.2023 г.; доп. соглашение к договору аренды № 01/10 2012 от 01.10.2012 г. по 31.12.2023 г.; договор аренды 01/03 2018 от 01.03.2018 г. по 31.12.2023 г.; доп. соглашение к договору аренды № 05/07.2015 от 01.07.2015 г. по 01.07.2025 г. | **932 000,00** | **93 200,00** |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Райбытуслуги» г. Калинковичи. 247710, Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 690-00-10 – ликвидатор Беланов Руслан Николаевич.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 16 декабря 2022 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**<u>В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того</u>**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **<u>5 (пять) %</u>**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **<u>Организатором</u>** в течение **<u>5 (пяти) рабочих дней</u>** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **<u>5 (пяти) рабочих дней</u>** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **<u>20 (двадцати) календарных дней</u>** от даты подписания протокола о результатах аукциона; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – <u>www.expert-usluga.by</u>, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

---

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 29 ноября 2022 г. в 10.30 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 40 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – здания магазина, принадлежащего Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности**

**Лот № 1: здание магазина, инв. № 334/С-12150.** Адрес объекта: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Ленина, 48А. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное здание, 1993 года постройки. Общая площадь – 220,3 кв. м

**Начальная цена лота: 53 496,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 3 496,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

**Земельный участок** для обслуживания здания магазина на праве постоянного пользования площадью **0,2370 га** с кадастровым номером **322855100002002436.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

